Наша ніва

30.06.2019

# У Мінску прайшла цырымонія закрыцця Еўрапейскіх гульняў




Цырымонія закрыцця II Еўрапейскіх гульняў стартавала на мінскім стадыёне «Дынама».

У цэнтры стадыёна ўстаноўлена кампазіцыя Нацыянальнай бібліятэкі, на якую спраецыяваныя моманты спаборніцтваў.

Падчас спаборніцтваў на II Еўрапейскіх гульнях з 21 па 30 чэрвеня разыграна 200 камплектаў узнагарод у 15 відах спорту. Медальны залік выйгралі спартсмены з Расіі, якія заваявалі 109 медалёў, 44 з якіх залатыя. Беларускія атлеты (221 удзельнік) заваявалі 69 медалёў, з іх 24 залатыя.